# Беларуская дыктоўка-2020

**У Міжнародны дзень роднай мовы педагогі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі і студэнты напісалі беларускую дыктоўку ў чытальнай зале МДУ імя А. Куляшова.**

Да іх далучыліся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз журналістаў» Святлана Шутава, а таксама прарэктары МДУ ім. А.А.Куляшова Уладзімір Ясеў і Алег Дзячэнка (член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь).

Яны пісалі ўрывак тэксту аўтабіяграфіі класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча «Дарога, якую прайшоў». Менавіта ён калісьці напісаў: «Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе. Хто забыў сваю мову — усё згубіў». Правяла дыктоўку вядучая інфармацыйных праграм «Радыё Магілёў» Марына Касьянава.

А ў ДК вобласці ў напісанні традыцыйнай дыктоўкі, прысвечанай Дню роднай мовы, прынялі ўдзел каля 100 чалавек. Тут тэкстам «Беларускай дыктоўкі-2020» стаў урывак з «Сівой легенды» Уладзіміра Караткевіча. Чытаў яго настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы №41 Аляксандр Цітоў.

Падарункам усім удзельнікам культурна-адукацыйнай акцыі стала прэм'ера літаратурнай пастаноўкі «Беларускі каляндар», падрыхтавалі якую народны тэатр ДК вобласці пад кіраўніцтвам Алы Кусковай, Дзіцячая тэатральная студыя і дзіцячы фальклорны калектыў «Покліч», паведамляе сайт mogilevnews.by.